Толькі песні жывыя,
І памруць яны разам са мной.
"У мяне ёсць багацце —
Мая родная мова,

Бо на ёй я люблю гэты свет,
Бо на ёй я сумую,
І на ёй пяю песні,
І на ёй пісаў вершы
Мой найлюбы паэт.
І няўцям будзе многім:
Чым тут ёсць ганарыцца —
У незайздросным і шэрым жыцці?

Тым, скажу, што жыву я,
У старане наймілейшай
І шаную ўсё тое,
Што далі мне бацькі.
Сваю мову цалую,
Свае песні спяваю,
У родным куце жыву я
На спрадвечнай зямлі...

Ад рэдакцыі. *Шчасця і творчага плёну табе, Яніна! Хай збудуцца ўсе твае мары.*

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

Чужая

Яна не плакала, а проста хацела выказаць незнаёмаму чалавеку сваё гора, адчай, каб аблегчыць душу, аблегчыць цяжкую, як магільная пліта, адзіноту. Але слёзы спорным асеннім дажджом каціліся па маршчыністых шчоках, і яна выцірала іх дрыготкімі далонямі. Рукі яе маленькія, зграбныя, перарабілі ў жыцці шмат работы. Аднаго занятку не выпала на іх долю — самага любімага, самага жаданага — няньчыць і песціць уласных дзяцей. Так ужо склалася, што ў Марыі Казавенька з вёскі Малыя Рапчаны ніколі не было сям'і. Жыла пры браце, працавала на розных работах у мясцовым калгасе. Працавала яшчэ і тады, калі пайшла на пенсію, бо мела здароўе, любіла працаваць. Маленькая, рухавая, яна ўсюды паспявала, адчуваючы сваю адзіноту, кожнаму старалася дагадзіць, дапамагчы. Таму і не раздумвала доўга, калі аднойчы адвячоркам у братнюю хату завітаў дваюродны пляменнік з бліжэйшага пасёлка Сымон Бранчэўскі.

— Цётка, дапамажыце нам з жонкай дзяцей падгадаваць, — ледзь не з парога пачаў той. — Ведаеце, як цяжка з двума малымі. Дачцэ ўсяго тры гады споўнілася, а сыну — усяго тры месяцы. Хоць крышку пажывіце ў нас...

І яна, зірнуўшы на брата і атрымаўшы яго маўклівую згоду, жвавенька сабрала ў сетку небагатыя пажыткі, ужо гатовая ехаць, рабіць, што скажуць. Збіралася пажыць у пасёлку ўсяго некалькі месяцаў, а пражыла амаль не дзесяць гадоў. Яна няньчыла малых, рабіла тое-сёе па гаспадарцы. Дзеці прывыклі да бабулі, палюбілі яе ласку, увагу. Яна лічыла гэтую сям'ю сваёй, роднай. Жонцы Сымона — Марыне — аддавала палавіну сваёй невялікай пенсіі. Тут збіралася век дажываць, дагаджала, каб, як не зможа, было каму вады падаць.

З часам маладыя абжыліся, пабудавалі новы дом. Ды толькі раптам сямейны воз пакаціўся пад адхон. Бясследна зніклі з дому згода, каханне, разуменне. Марына Вікенцьеўна з болем назірала, як пакутуюць ад бацькоўскага разладу дзеці, з трывогай думала аб тым, што чакае яе.

Неўзабаве маладыя развяліся. Падзялілі дом. Сымон пусціў у сваю палавіну кватарантаў, а сам паехаў жыць у пасёлак цагельнага завода.

— Куды ж мне цяпер? — пытала сама ў сябе бяссоннымі начамі бабулька. Але адказу не знаходзіла. Яе вельмі прыгнятала ўсведамленне таго, што лішняя, не патрэбная ў гэтай хаце. І аднойчы, змучаная сумненнямі, адзінотай, задала гэта пытанне Марыне.

— Жыві, калі хочаш, са мной, — коратка адказала яна.

...З той пары мінула тры гады, і вось сёлета на бабулю пацягнула скразняком адчужанасці. Марыне не падабалася, як Марыя Вікенцьеўна ходзіць, як гаворыць. Усё маладую жанчыну раздражняла.

Аднойчы, калі бабуля запытала, чым выклікала такую няміласць. Марына холадна адказала:

— Чужая ты мне. З міласці трымала цябе ў сваім доме, а цяпер не хачу. Не мне ты цётка, а майму былому мужу. Ён цябе сюды прывёз. Вось і едзь цяпер да яго ды жыві там. А мне не патрэбна.

Туман крыўды заслаў старэнькай вочы, слёзы перахапілі дыханне. Чужая... Старая... Нікому не патрэбная. Не цешыла яна сябе ілюзіямі, не спадзявалася на міласць пляменніка. Палавіну дома аддаў кватарантам, а цётцы, якая выгадавала яго дзяцей, месца не знойдзецца. Так яно і выйшла.

— Бяры сваё дабро і ідзі куды хочаш, — заявіла маладзіца. — Ты мне больш не патрэбна. Трымай пашпарт. Выпісала я цябе са свайго дому.

Яна ішла па вячэрніх вуліцах пасёлка, ад крыўды, абразы, гора не бачыла перад сабой нічога. Куды падацца, дзе прыхіліць галаву? Каму расказаць пра бяду сваю? Паехала ў вёску да брата.

— Я сам хворы, нямоглы, — адводзячы позірк, сказаў ён. — Як няма дзе пераначаваць, то пераначуй, а жыць табе тут не выпадае.

Потым яна падалася да сваякоў у горад, зноў паехала ў вёску. Так і вандруе без прытулку, без ласкі і цяпла, з горкай крыўдай у змучаным сэрцы.

Добрыя людзі параілі, што трэба звярнуцца ў суд і ён прысудзіць пляменніку даць ёй прытулак. І яна спадзяецца на гэты вялікі цуд...

Калі даводзіцца начаваць у пасёлку, вечарамі прыходзіць на вуліцу, дзе жыла, і скрозь слёзы глядзіць на дыхтоўны дом, дзе прайшло столькі гадоў яе жыцця. Вось знаёмая сцяжынка да ганка. За асветленым акном — постаць Марыны. Яна схілілася над сталом, за якім дзеці робяць урокі, нешта тлумачыць ім. Усё так, як было раней. Толькі ёй тут не знайшлося месца, не знайшлося кутка, душэўнага цяпла і ласкі.

Адно слова — чужая...

Марына КРАСУЦКАЯ.

Лесничие с января без выходных

Леса Европы легко противопоставлять лесам Беларуси. В Европе, как известно, и трава ровная, и деревья одинаково ухожены, и кролики откормленные глаза мозолят... А у нас все в первозданном виде: дико и натурально. Конечно, эту “дикость” всеми силами пытаются облагородить. Как? Об этом корреспондент “Народной воли” беседует с главным лесничим УП “Минское лесопарковое хозяйство” ***Георгием КУРИЛОВИЧЕМ.***



— Георгий Леонидович, расскажите, пожалуйста, какие территории находятся в ведении Минского лесопаркового хозяйства?

— Наша лесопарковая зона — это 33 тысячи гектаров угодий. Она складывается из восьми лесничеств: Боровлянское, Городское, Ждановичское, Колодищанское, Минское, Острошицко-Городское, Ратомское и Сосненское. Также лесопарковое хозяйство разделено на четыре хозяйственные части: городские леса, парки, лесопарки, лесопарковые леса. Городские леса находятся в черте города. Лесопарки и парки по режиму ведения хозяйства соответствуют городским лесам, но находятся за чертой города (прилегают к Минскому морю и Вяче). А лесопарковые леса занимают 65%. Это леса, предназначенные для отдыха горожан, прогулок, туристических маршрутов.

— Весна в разгаре, а уборка лесов затянулась. Лесопарки до сих пор завалены сучьями, мусором...

— Вы же знаете, какие снегопады были нынче! Из-за них очень сильно пострадали сосновые леса. Очистить их не так просто. С января у лесников не было выходных.

— Интересно, а что делают с поваленным лесом?

— Если это годится только на дрова, то их и заготавливаем. Хорошую сломанную сосну везем в цех, там ее распиливают на доски. Из заготовленных материалов благоустраиваем места отдыха: мастерим беседки, скамейки...

— Кстати, вы периодически вырубаете сухостой, а посадкой новых деревьев занимаетесь?

— Мы ежегодно садим до миллиона деревьев. Вот уже вторую неделю заготавливаем посадочный материал красного дуба. В Старобинском лесхозе заказали ясень, в Стародорожском покупаем сосну и ель. Уже с завтрашнего дня начинаются посадки. Мы больше высаживаем, чем вырубаем.

Чисто хвойные леса опасны в пожарном отношении. А потому разводим смешанные посадки — сосна, красный дуб, ясень, береза... Только вся загвоздка в том, что денег не хватает. Один саженец маленького ясеня стоит сто рублей, а нам надо сто тысяч посадочного материала.

— Слышала, что в лесопарках запрещено сжигать сучья, но их все равно сжигают. Почему?

— Сжигание сучьев запрещено в черте города. Что касается территории за кольцевой дорогой, то я этот вопрос согласовывал с Министерством лесного хозяйства, с районным МЧС. Нет запрещения сжигать порубочные остатки. Не в состоянии лесопарковое хозяйство вывозить все сучья. Но делать это нужно строго соблюдая противопожарные меры.

— Как известно, в Беларуси лес — это собственность государства и за его состояние отвечают государственные служащие. А в России леса стали отдавать в частную собственность. Как Вы к этому относитесь?

— В соседней Польше леса давно передали в частные руки. У нас, действительно, пока такого нет. Но для нас это пока неактуально. Тут много нюансов... Чтобы брать лес в аренду, надо с него выгоду иметь. Например, леспаркхоз никто и никогда не возьмет в частную собственность. С него невозможно получить выгоду. Так что в лесопарковом хозяйстве без помощи государства порядок не наведешь...

Дарья ГАВРИЛОВА.
photo.bymedia.net

СПОРТ

У рэйтынгу Кубка Дэвіса Беларусь узнялася на восьмае месца

У чарговым рэйтынгу Кубка Дэвіса, апублікаваным 13 красавіка па выніках чвэрцьфінальнай стадыі Сусветнай групы, зборная Беларусі ўзнялася з дзесятага на восьмае месца, а колькасць набраных ёю ачкоў вырасла з 4.992,5 да 8.617,5. Гэта адбылося дзякуючы поспеху беларусаў у матчы з камандай Аргенціны. Між тым самі лацінаамерыканцы захавалі пятую пазіцыю, хаця і страцілі 2.175 ачкоў.

Вось як выглядае цяпер першая дзесятка (у дужках — месцы і ачкі ў папярэднім рэйтынгу):

1 (2). Францыя — 27.250 (24.500)
2 (1). Аўстралія — 26.250 (29.750)
3 (3). Іспанія — 22.000 (20.000)
4 (4). Расія — 17.638,8 (18.661,3)
5 (5). Аргенціна — 10.955 (13.130)
6 (7). ЗША — 10.795 (8.817,5)
7 (6). Швейцарыя — 9.976,6 (11.257,8)
8 (10). Беларусь — 8.617,5 (4.992,5)
9 (8). Швецыя — 7.125 (8.312,5)
10 (9). Галандыя — 5.750 (6.750)

Наступны рэйтынг будзе апублікаваны пасля паўфіналаў, якія пройдуць 24—26 верасня. Нагадаем, што беларускія тэнісісты згуляюць у гасцях з амерыканцамі.

Нацыянальная зборная Беларусі па хакеі атрымала другую перамогу на чэмпіянаце свету ў Нарвегіі

Нацыянальная зборная Беларусі па хакеі працягвае паспяховае выступленне на чэмпіянаце свету ў групе “А” першага дывізіёна, які праходзіць у Нарвегіі. 13 красавіка падапечныя Міхаіла Захарава атрымалі другую перамогу, выйграўшы ў зборнай Галандыі з лікам 7:2 (3:1, 1:1, 3:0).

Наступны матч беларуская зборная правядзе сёння, 15 красавіка, супраць каманды Вялікабрытаніі.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

Хакеістаў-юніёраў чакае барацьба за выжыванне

Беларусы прайгралі ўсе свае гульні на першым этапе чэмпіянату свету па хакеі сярод юніёраў да 18 гадоў, што праходзіць у Мінску. У сваёй апошняй гульні ў групе беларусы саступілі камандзе Швецыі з лікам 0:4. Цяпер беларусаў чакае барацьба за выжыванне ў групе мацнейшых. Сапернікамі стануць каманды Даніі, Фінляндыі і Нарвегіі. Вынікі гульняў Данія — Беларусь (4:1) і Фінляндыя — Нарвегія (9:0) аўтаматычна пераносяцца ў залік турніру за выжыванне. Гульні адбудуцца ў Лядовым палацы.

У апошні дзень групавога этапу сенсацыйна зборная ЗША перамагла Канаду з лікам 2:1.

У групе “В” не пашанцавала фінам. У гульні з чэхамі яны прапусцілі на апошніх секундах гульні. Лік 1:1 не дазволіў ім працягнуць барацьбу за ўзнагароды. Расіяне і славакі згулялі 2:2, прычым па ходзе гульні славакі перамагалі — 2:0.

Каманды ЗША і Расіі аўтаматычна трапілі ў паўфінал. Іх сапернікі вызначацца ў гульнях Чэхія — Швецыя і Канада — Славакія адпаведна. Гульні адбудуцца ў пятніцу, 16 красавіка, а 15-й і 19-й гадзінах у Палацы спорту.

Антось ПАВЕРКА.

Падтрымаем «Аляксандру і Канстанціна»

Да падрыхтоўкі да міжнароднага конкурсу песні “Еўрабачанне-2004" плануецца падключыць Міністэрства спорту і турызму Беларусі. Пра гэта паведаміў 13 красавіка на прэс-канферэнцыі ў Мінску міністр культуры Леанід Гуляка.



Паводле слоў Л.Гулякі, ён звярнуўся да міністра спорту і турызму Юрыя Сівакова, “каб у перыяд, калі будзе праходзіць конкурс, стварыць беларускім удзельнікам — дуэту "Аляксандра і Канстанцін" — утульнасць знаходжання ў Стамбуле і сплanаваць на гэты час турыстычныя паездкі, каб там з’явіліся беларускія турысты". Паводле слоў міністра, з падобнымі просьбамі ён таксама звярнуўся і ў вядучыя турагенцтвы краіны.

Акрамя таго, Л.Гуляка звярнуўся да пасла Беларусі ў Турцыі з просьбай пасадзейнічаць арганізацыі прэзентацыі беларускіх выканаўцаў. Паводле слоў міністра, пасля ўдзелу дуэта ў конкурсе магчыма арганізацыя гастроляў “Аляксандры і Канстанціна” ў Турцыі. Можа быць, гэта адбудзецца ў наступным годзе, дадаў Л.Гуляка.

Ён таксама нагадаў, што сёлета на конкурсе “Еўрабачанне” ўпершыню прынята “новая форма правядзення спаборніцтва”. Конкурс будзе складацца з паўфіналу, які пройдзе 12 мая, і фіналу — 15 мая. У “Еўрабачанні” возьмуць удзел 36 краін. Прадстаўнікі 14 краін, паказаўшых на леташнім конкурсе высокія вынікі (Францыя, Германія, Іспанія, Турцыя, Аўстрыя, Бельгія, Расія, Польшча і іншыя), ужо дапушчаны да ўдзелу ў фінале. Беларускі дуэт у ліку прадстаўнікоў 22 дзяржаў будзе дэбютаваць у паўфінале. Дзесяць з гэтых удзельнікаў выйдуць у фінал.

Каб вызначыць чарговасць выступленняў паўфіналістаў, у прамым эфіры адразу пасля паўфіналу будзе праведзена жараб’ёўка. Такім чынам, у фінале возьмуць удзел 24 краіны.

Месцам правядзення конкурсу стане адзін з самых вялікіх у Стамбуле спартыўных комплексаў, разлічаны на 7.500 месцаў. 36 краінам-удзельніцам прадастаўляецца 540 білетаў на касцюміраваныя рэпетыцыі і самі канцэрты.

Асноўная канцэпцыя шоу гэтага года — “Пад адным небам”. Сёлета ж у конкурсу з’явіўся новы афіцыйны лагатып з выявай сэрца.

Штогод конкурс “Еўрабачанне” прыцягвае ўвагу больш чым 100 мільёнаў тэлегледачоў. Праектны бюджэт спаборніцтва гэтага года дасягае 11 мільёнаў швейцарскіх франкаў.

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

Беларускай эміграцыі прысвячаецца

Міжнароднае грамадскае аб’яднанне “Згуртаванне беларусаў свету ”Бацькаўшчына" абвяшчае конкурс сярод студэнтаў і маладых навукоўцаў (да 35 гадоў) на лепшы артыкул, прысвечаны беларускай эміграцыі:

— яе гісторыі, сучаснасці, культуры,
— філасофіі беларускай дыяспары,
— яе асяродкам, асобным дзеячам, помнікам, цэрквам,
— выданням беларускай дыяспары,
— падзеям,
— тэрмінам, актуаліям ды іншаму.

Працы павінны быць арыгінальным даследаваннем аўтараў і насіць энцыклапедычны характар (грунтоўна і ўсебакова асвятляючы тэму). Лепшыя працы ўвойдуць у энцыклапедыю беларускай дыяспары (спачатку — электронную версію на сайце МГА “ЗБС ”Бацькаўшчына"), а пераможцы будуць узнагароджаны. Адбор прац будзе ажыццяўляцца кампетэнтнай экспертнай камісіяй.

Праца павінна ўтрымліваць каардынаты (пры наяўнасці — навуковую ступень) аўтара, бібліяграфію да артыкула. Памер — да 8 друкаваных старонак (шрыфт Times New Roman 14 пт, праз 1,5 інтэрвалу).

Працы прымаюцца да 20 верасня па адрасе: **220030, Рэспубліка Беларусь, г.Мінск, вул.Рэвалюцыйная, 15, для МГА “ЗБС ”Бацькаўшчына".** *Тэл. для даведак* **(017) 289-31-94, e-mail: zbsb@lingvo.minsk.by**

Тураў рыхтуецца да свята

На падрыхтоўку святкавання Дня беларускага пісьменства, які будзе адзначацца ў старажытным Тураве (Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласці), ужо зрасходавана 300 млн. рублёў са сродкаў дзяржаўнага бюджэту. Пра гэта БелаПАН паведаміў намеснік старшыні Жыткавіцкага райвыканкама Уладзімір Гулюта.

Паводле яго слоў, гэтыя сродкі накіраваны на добраўпарадкаванне гарадскога пасёлка Тураў. Сярод аб’ектаў добраўпарадкавання — цэнтральная вуліца Ленінская, уздоўж якой устанаўліваюцца новыя платы, а таксама мемарыял выдатнаму асветніку Кірыле Тураўскаму. Ідзе рамонт помнікаў, у тым ліку землякам, загінуўшым у гады вайны, а таксама на брацкіх магілах воінаў, якія загінулі за вызваленне Турава ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Акрамя таго, вядуцца работы па зносе старых пустых будынкаў пасёлка і іншых закінутых збудаванняў. Як адзначыў У.Гулюта, прадугледжаны рамонт этнаграфічнага і гісторыка-краязнаўчага музеяў, а таксама выпуск сувенірных паліграфічных выданняў і выданне зборніка твораў мясцовых пісьменнікаў.

Паводле слоў У.Гулюты, на правядзенне ўсіх запланаваных работ неабходны “не адзін мільярд рублёў”. “Паколькі дзяржава не мае такіх грошай, Гомельскі абласны аргкамітэт па правядзенні Дня беларускага пісьменства ў Тураве аб’явіў збор сродкаў на аднаўленне помнікаў нацыянальнай гісторыі і культуры вобласці”, — паведаміў намеснік старшыні райвыканкама.

Марат ГАРАВЫ.

ШАШКІ

Замыканне пяці шашак

Працягваем класіфікацыйны конкурс-13. У якасці сёмага задання падаем камбінацыйную праблему міжнароднага гросмайстра Уладзіміра Матуса (Масква):

Белыя: a5, b4, b6, c5, e3, f2, g1, g5 (8).

Чорныя: b2, b8, d4, e5, e7, f6, h4 (7).

Выйгрыш (два ачкі).

У класіфікацыйным жа конкурсе-14 прапануем дзевятае заданне — канцоўку кандыдата ў майстры спорту Васіля Грабенкі (Мінск), у якой замыкаюцца дамка і чатыры простыя чорных:


Белыя: a1, c1, c3, c5, d2, g1, h6 (7).

Чорныя: a5, d6, e3, e7, f2, f4, h4 (7).

Ход белых (тры ачкі).

Адзін з пераможцаў гэтага конкурсу атрымае прыз аўтара задання — кнігу А.Гантварга “50 паядынкаў на 100 клетках” (Мінск, “Полымя”, 1986 г.).

Тэрмін для адказаў — традыцыйныя два тыдні. Чакаем іх па адрасе: **220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты “Народная воля”, “Шашкі”.**



Супаставім рашэнні

Праверце, калі ласка, рашэнні пазіцый, змешчаных 12 лютага.

“На рэдкім полі” (заданне №5 (задача У.Матуса) класіфікацыйнага конкурсу-13): g5 (h6 A) g3, e3, g7, h6#. A (d8) g7, c7, e3, a7, f2 (f4 B) hg3, g1#. B (h4) hg3#. Магчыма перастаноўка ходаў: 1.fg5 h:d8 2.bg7 (замест 2.dc7) 3.dc7 і г.д.

“Апрацоўка замалёвак”: №2 (А.Ляхоўскі) — 2.gh2 3.ed6 4.ba5 5.a:c7 6.a:e7 7.h:f2 8.h:f4x.

“Пазіцыя з партыі” (Л.Жыхар—А.Супрановіч): 1.de3 2.cb6 3.b:h6 4.a:c5x.

Рашылі: В.Бялоў, М.Буканаў, А.Сняжкоў, В.Касцян, В.Таратушкін, В.Казарэвіч, В.Дзялендзік, Л.Жыхар, Ч.Сінкевіч, Аляксандра Камінская, А.Пярхальскі, С.Супрунюк, А.Панкрацёнка, П.Елісееў, А.Сымановіч, Л.Пасвісцелік.

А вось наступныя канкурсанты за ўказанне 2.bg7 зарабілі па адным дадатковым ачку: В.Астрынскі, А.Кагоцька, А.Ашыхмін, А.Чумакоў, У.Мазанік, І.Мацкевіч, П.Чэрнак, Г.Логвінаў, П.Каролік, М.Андрушчанкаў, А.Янчук, Ф.Хадачынскі, Д.Камчыцкі, А.Іванькоў, В.Краўчук, М.Гардзіеўскі, А.Белы, А.Ляхоўскі, М.Блізнец, В.Масквіч, М.Падбярэзскі, Л.Вітошкін, У.Сапяжынскі.

Рашэнні заданняў таксама залічаны: №4 класіфікацыйнага конкурсу-13 — А.Сымановічу, №5 класіфікацыйнага конкурсу-12 — А.Сымановічу, А.Сапегіну, У.Сапяжынскаму і Л.Вітошкіну.

Пазіцыі з партый

Аб чэмпіянаце краіны па шашках-64 сярод жанчын (вышэйшая ліга) мы ўжо паведамлялі. У размове з намі майстар спорту Генадзь Барысаў прывёў дзве павучальныя сітуацыі з гэтага турніру:

1.Белыя (Марына Разаева): a5, c3, d2, e3, e5, f4 (6).

Чорныя (Ніна Грышаева): a3, c5, c7, d6, g5, h6 (6).

1.ef6 2.cd4 cb4 3.a:c3 cb6 4.cb4 5.de5x.

2.Белыя (Ганна Зінчук): b4, c3, d2, d4, g1, h4 (6).

Чорныя (Кацярына Шпакава): b6, b8, d6, e5, f4, f6 (6).

1.bc5 2.c:c7 e:e1 3.cd8 fg3! (вось гэтага ходу белыя не чакалі) 4.d:g5 ba7 5.h:f2 e:d8x.

На мармуровай пліце

У мінулым выпуску мы расказалі, што легендарны шашыст СССР Васіль Аляксандравіч Сокаў загінуў падчас Вялікай Айчыннай вайны смерцю храбрых пры вызваленні горада Нарвы. Сёння ўдакладняем і дадаем: на мармуровай пліце ля помніка яму адлюстравана яго пазіцыя:

Белыя: дамка f8, простыя e1, f2, f4, g3 (5).

Чорныя: дамка a1, простыя a3, b2, f6 (4).

Белыя перамагаюць — і толькі шляхам запірання дамкі і дзвюх простых чорных: 1.fg5 2.ed2! 3.fe3 4.dc3 5.fh6 6.h:c1#.

Васіль Сокаў склаў на такую тэму і задачу:

Белыя: дамкі a5, b8, d6, e1, g3, простыя b6, c5, f2 (8).

Чорныя: a7, b2, h4 (3).

Df4 (a1 A) cd6, bd6, ab4, fe3, c3, c1#. A (c1) h2, bf4, eg3, e1#.

Урокі кампазіцыі

Згодна з сучаснымі патрабаваннямі, задача Васіля Сокава мае недахоп, бо дапускае перастаноўку ходаў: 1.df4 (a1) 2.cd6 3.fe3 (замест 3.bd6 4.ab4) 4.ec3 5.bd6 6.b4 і 7.c1#.

Спрабуюць складаць задачы і нашы чытачы. Адна з іх мінчаніну Міхаілу Давыдзенку ўдалася:

Белыя: дамкі b4, d8, f2, простыя f6, h4 (5).

Чорныя: h6, h8 (2).

G7 (f8 A) de7, e7, hg5 (f6 B) d6, g3#. B (h6) c5, g3, g1#.

A (f6, f4) g5, bc5, h4, g3, g1#. Тут усё па правілах: простая чорных запіраецца на h4 і h2 без лішніх шашак. Аднак узнікае пытанне: а ці не супадае задача? Чакаем адказу на яго.

Чэмпіянат

Рэдакцыя газеты “Пінскі веснік” і мясцовая федэрацыя шашак аб’явілі першы адкрыты чэмпіянат свайго горада па складанні задач, камбінацыйных мініяцюр і праблем-64. У кожны раздзел прадстаўляюцца не больш за чатыры кампазіцыі — як новыя, так і апублікаваныя пасля 15 красавіка 2003 года, але якія раней не ўдзельнічалі ў іншых спаборніцтвах. Залік ідзе па трох лепшых работах. Па тры прызёры ўзнагароджваюцца рэдакцыяй газеты. Судзейства ажыццяўляецца па Кодэксе шашачнай кампазіцыі Беларусі 2000 года. Творы накіроўваюцца да 15 мая 2004 года на адрас рэдакцыі газеты: 225710, Беларусь, Брэсцкая вобл., г.Пінск, вул.Савецкая, 20.

Мікалай ГРУШЭЎСКІ, майстар спорту.

ШАХМАТЫ

Юбилей гроссмейстера

Недавно свое 80-летие отметил один из самых выдающихся шахматистов планеты международный гроссмейстер, заслуженный мастер спорта, неоднократный чемпион СССР и победитель крупнейших международных турниров Давид Ионович Бронштейн. В 1951 году Бронштейн, после победы в соревнованиях претендентов, сыграл вничью матч за звание чемпиона мира с Михаилом Ботвинником.

Давид Ионович прославился также своими блестящими творческими достижениями. Его партии изобилуют замечательными комбинациями, оригинальными замыслами, вызывающими восхищение любителей королевской игры.

Бронштейн не занимался специально шахматной композицией. Тем не менее им составлено несколько произведений, в основном этюдов. Следующая задача-двухходовка составлена в соавторстве с В.Чепижным.

Д.Бронштейн, В.Чепижный

Белые: Kpb1, Фg5, Лe2, Cg2, Kf1 (5).

Черные: Kpg1, Лg8, Лh1, Cf7, пп. d4, e6, h5 (7).

Мат в 2 хода.

Решить ее мы предлагаем нашим читателям. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты “Народная воля”, “Шахматы”.**



Партия с Виктором Корчным, сыгранная в чемпионате СССР 1962 года, завершилась очень эффектным комбинационным ударом.

Д.Бронштейн — В.Корчной
Испанская партия

1.e4 e5 2.Kf3 Kc6 3.Cb5 a6 4.Ca4 Kf6 5.o-o K:e4 6.d4 b5 7.Cb3 d5 8.de Ce6 9.c3 Ce7 10.Cc2 o-o 11.Фe2 f5 12.ef C:f6?! Черные жертвуют пешку, рассчитывая взамен захватить инициативу. Однако надежнее играть 12...Л:f6 13.Kbd2 Cf5 14.K:e4 C:e4 15.C:e4 de 16.Ф:e4 Фd7 17.Cf4 Лae8 18.Фc2 Ch4 19.Cg3 C:g3 20.hg Ke5 21.K:e5 Л:e5 22.Лfe1 Лd5 23.Лad1 c5 24.a4! Ослабляя пешечную структуру черных. 24...Лd8 25.Л:d5 Ф:d5 26.ab ab 27.Фe2 b4 28.cb cb 29.Фg4 b3 30.Kph2! (Атаку надо готовить. Немедленное 30.Лe7? отражалось путем 30...Фd1+ 31.Ф:d1 Л:d1+ 32.Kph2 Лd2) 30...Фf7 31.Фg5 Лd7 32.f3 h6 33.Фe3 Лd8 (Грозило 34.Фe8+ с переходом в выигранный ладейный эндшпиль) 34.g4 Kph8 35.Фb6! Уже здесь Бронштейн задумал свою комбинацию. 35...Лd2. Естественная реакция, черные активизируют ладью, угрожает взятие ферзем на f3 36.Фb8+ Kph7 37.Лe8 Ф:f3? Попадая в расставленные сети. Правда, предвидеть последовавшую комбинацию было непросто. 38.Лh8+ Kpg6 39.Л:h6+!! Блестящий удар. После продолжительного раздумья Корчной здесь сдался. Варианты очень красивы: 39...gh 40.Фg8+ Kpf6 41.Фf8+, 39...Kpf7 40.Фc7+ Kpg8 41.Фc8+ Kpf7 42.Фe6+, 39...Kpg5 40.Фe5+ Kp:g4 41.Лg6+ Kph4 42.Фg5x, наконец, 39...Kp:h6 40.Фh8+ Kpg6 41.Фh5+ Kpf6 42.g5+! с выигрышем ферзя. Блестяще!

Европейский экзамен

В Дрездене (Германия) проходил женский чемпионат Европы по шахматам 2004 года. За европейскую шахматную корону вели борьбу более ста участниц. Соревнования проводились по швейцарской системе в 12 туров. В острейшей борьбе к финишу первыми с одинаковой суммой очков — 9,5 из 12 — пришли голландка китайского происхождения Жаокин Пенг и Александра Костенюк из России.

Чтобы определить чемпионку, пришлось проводить дополнительный тай-брейк, соперницы сыграли матч в быстрые шахматы (15 минут) из двух партий. Успеха добилась россиянка, выигравшая со счетом 1,5:0,5. Вот как проходила решающая партия.

Жаокин Пенг — А.Костенюк
Ферзевый гамбит

1.d4 d5 2.c4 e6 3.Kf3 Kf6 4.Kc3 dc 5.e3 a6 6.a4 c5 7.C:c4 Kc6 8.o-o Ce7 9.Фd3 o-o 10.Лd1 cd 11.ed Kb4 12.Фe2 b6 13.Ke5 Cb7 14.Лa3 Kbd5 15.Лb3 Фc7 16.Cg5 Лfe8 17.Лe1 Cd6 18.h4 Kd7 19.K:d7 Ф:d7 20.Ke4 Cc7 21.Лa1 Фc6 22.Cd3 f5 23.Лc1 Ф:a4 24.Лa3 Фd7 25.Kc3 Kf4 26.C:f4 C:f4 27.Лd1 b5 28.Лaa1 Фc6 29.d5 ed 30.Фf1 d4 31.K:b5 Фf6 32.Cc4+ Kph8 33.K:d4 Ф:h4. **Белые сдались.**

На пол-очка от лидеров отстали сразу 3 участницы: гроссмейстеры Антуанетта Стефанова (Болгария), Наталья Жукова (Украина) и Нана Дзагнидзе (Грузия). Дополнительный тай-брейк принес успех болгарской шахматистке, завоевавшей бронзовую медаль. В число 12 лучших, которые получили право выступить на чемпионате мира, вошли также Ирина Славина (дочь экс-чемпионки Беларуси Галины Ожигиной) из России, румынка Кристина Фойшор, Кетеван Арахамия-Грант (Грузия), шведка Пиа Крамлинг, Моника Сочко (Польша), россиянка Татьяна Косинцева и англичанка Йованка Хоуску. Все они набрали по 8 очков.

В чемпионате приняли участие две белорусские спортсменки: международный гроссмейстер Генриетта Лагвилава (Минск) и чемпионка Беларуси 2002 года международный мастер Анна Шаревич (Брест). Обе показали одинаковый результат — 6,5 очка из 12 и заняли места в середине турнирной таблицы. Для дебютантки чемпионата 18-летней Анны Шаревич такой итог следует признать неплохим. Вот одна из партий брестчанки, сыгранная в Дрездене.

Т.Босбун-Ланчава — А.Шаревич
Ферзевый гамбит

1.d4 d5 2.Kf3 Kf6 3.c4 e6 4.Kc3 Ce7 5.cd ed 6.Cf4 c6 7.Фc2 o-o 8.e3 Cd6 9.Ke5 Фe7 10.Cd3 Kbd7 11.K:d7 C:d7 12.Cg5 h6 13.Ch4 Фe6 14.o-o-o b5 15.Kpb1 b4 16.Ka4 Лab8 17.b3 Ke4 18.f3 Kc3+ 19.K:c3 bc 20.e4 a5 21.ed Ф:d5 22.Ф:c3 a4 23.Cc4 Фf5+ 24.Kpb2 ab 25.ab Cb4 26.Фc2 Ca3+ 27.Kpb1 Фh5 28.Ce1 Cf5 29.Cd3 Ce6 30.Cc4 C:c4 31.Ф:c4 Фg6+ 32.Лd3 Ф:g2. **Белые сдались.**

Четверг, 15 апреля

БТ

07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.30, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Новости.
07.05, 07.35, 08.10, 08.35 “Доброе утро, Беларусь!”
07.30, 08.30, 19.55 “Деловая жизнь”. Экономическая передача.
09.05, 19.05 “Американский дядюшка”. Сериал.
10.05 “Личная жизнь официальных людей”. Сериал.
11.10, 17.25 “Богатые и знаменитые”. Сериал.
12.15 “Евровидение-2004”.
12.30 “Гусарская баллада”. Фильм.
14.10 “Точка”.
14.55 Хоккей. Чемпионат мира.
17.10 “Специальный репортаж”.
18.30 “Новая коллекция Олега Лукашевича”.
20.00 “Личная жизнь официальных людей”. Сериал.
21.00 “Панорама”.
21.50 “Права человека. Взгляд в мир”.
22.00 “Жить надо с риском”. Комедия.
23.45 “Клип-обойма”.

ОНТ

07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 18.00, 20.30, 23.10 “Наши новости”.
07.05 “Наше утро”.
Техническая профилактика с 09.05 до 17.00
17.05 “Берег мечты”. Сериал.
18.10 “Дом”. Реалити-шоу.
19.05 “Клон”. Сериал.
20.00 “Время”.
21.00 “Евлампия Романова: следствие ведет дилетант”. Сериал.
22.05 “Улицы разбитых фонарей”. Сериал.
23.25 “Фабрика звезд-4”.

РОССИЯ

07.45, 19.55 “Небо и земля”. Сериал.
08.50 “Короткое замыкание”. Ток-шоу.
09.45, 23.15 “Вести. Дежурная часть”.
10.00, 16.00, 19.00 “Вести”.
10.30, 19.30 “Местное время. Вести — Москва”.
10.50 “Что хочет женщина”. Ток-шоу.
11.50, 21.00 “Ключи от бездны. Операция ”Голем”. Сериал.
16.10 “Крот”. Сериал.
17.05 “Комиссар Рекс”. Сериал.
18.00 “Закон”. Сериал.
19.50 “Спокойной ночи, малыши!”.
22.00 “Вести +”.
22.20 “Исторические хроники” с Николаем Сванидзе”.
23.30 “О, где же ты, брат?”. Комедия.

ЛАД

06.30 EURONEWS.
08.00, 14.00, 20.00 Новости.
08.10 “Площадь искусств”.
08.35 Оборотная сторона ламбады”. Док.фильм.
09.35 “Здоровье”. Тележурнал.
10.05 “Между нами, женщинами”. Тележурнал.
10.30, 21.15 “Грешная Анхелика”. Сериал.
11.15, 13.20 “Обычный необычный день”. Семейный канал.
11.45 “Смелые люди”. Фильм.
13.50 “Самый младший дождик”. Мультфильм.
14.10 “Мультиклуб”.
15.05 “Зеркало, зеркала”. Сериал.
15.30 “Не зевай!”. Телеканал для детей.
15.40 “Бум”. Тележурнал для школьников.
16.05 “Киту-домовой”. Мультфильм.
16.25 “Век неблагодарного прогресса”. Док.сериал.
17.20 Хоккей. Чемпионат мира.
19.05 “Джек и бобовое дерево”. Приключенческий фильм.
20.15 “Колыбельная”.
20.30 “Дела семейные”.
22.05 “Россия молодая”. Сериал.

НТВ

09.00, 11.00, 16.00, 18.00 “Сегодня”.
09.25 “Квартирный вопрос”.
10.20 “Страна советов”. Ток-шоу.
14.35 “Принцип домино”. Ток-шоу.
16.30 “Дальнобойщики”. “Левый груз”. Сериал.
17.35 “Протокол”.
18.40, 23.10 “Мур есть мур”. Сериал.
19.45 “Пятый ангел”. Сериал.
21.00 “Страна и мир”.
21.35 “К барьеру”. Ток-шоу.
22.40 “Тайны разведки.

СТВ+RenTV

06.15, 18.00 “Минщина. Люди, события, факты”.
06.25, 15.40 “Пауэр рейнджерс, или Могучие рейнджеры в космосе”. Телесериал.
06.50 “Супершоу братьев Марио”. Мультсериал.
07.30, 16.30, 19.30, 22.45 “24 часа”.
07.50, 20.00 “СТВ-спорт”.
08.05 “Светская хроника”.
08.20, 23.05 “Технология”.
08.30 “Ecce Homo”.
08.45, 20.40 “Фильм, фильм, фильм”.
Профилактика 09.00–15.00
15.05 Мультфильм.
15.15 “Рыцари света”. Мультсериал.
16.00 “Веселые баксы”.
16.15 “Добро пожаловаться...”.
17.00 “Невозможные зеленые глаза”. Телесериал.
18.15 “Театральные истории”.
18.30 “Любовь императора”. Телесериал.
20.15 “Тема дня”.
20.25 “Добрый вечер, малыш...”.
20.55 “Большой удар”. Боевик.
23.15 “Турпоход”.
23.25 “Душой исполненный” полет”. Балет.
23.55 “Секретные материалы”. Телесериал.
00.40 “Новости СНГ”.

8-Й КАНАЛ

16.30 “Мультпарад” от “Бюргера”.
16.45, 19.50 “Любовники пустыни”. Сериал.
17.40 “Европа сегодня”.
18.10, 21.00 “К-видео”. “Топ-8”.
18.15 “Приключения раввина Якова”. Комедия.
20.45 “Вечарніца”.
21.30 “Гонщики”. Худ.фильм.

ТВ ЦЕНТР

04.45, 06.30 “Настроение”.
07.35 “Газетный дождь”.
07.45, 18.55 “Тайный знак”. Сериал.
08.45 “Сезон охоты”. Сериал.
09.40 “Войди в свой дом”.
09.45 “Телемагазин”.
10.00, 13.00, 17.00, 21.00 “События. Время московское”.
10.15 “Дата”.
11.10 “А у нас во дворе...”.
11.40 “Игра в прятки”.
12.00 “Доходное место”.
12.05, 23.00 “Петровка, 38”.
12.25 “Деловая Москва”.
13.15 “Инспектор Кресс”. Сериал.
14.20 “Экспо-новости”.
14.30 “21-й кабинет”.
15.00 “Регионы: прямая речь”.
15.30 “Тайна зеленой комнаты”.
16.00 “Поместье Нанчерроу”. Сериал.
17.15 “Дом на Котельниках”.
18.00 “Страсти по Саломее”. Телесериал.
18.45 “Экспо-новости”.
18.50 “Пять минут деловой Москвы”.
19.55 “Сезон охоты”. Сериал.
21.40 “Наша версия”. “Под грифом ”Секретно”.
22.30 “Времечко”.
23.20 “25-й час. События. Время московское”.
23.45 “Музыкальный серпантин”.
00.00 “Принцесса Мария Бонапарт”. Сериал.
00.45 “Синий троллейбус”.

EUROSPORT

09.30 Олимпийские игры. Культурная программа.
09.45 Теннис. Новичок.
10.00, 14.15, 15.15 Футбол. Кубок УЕФА.
12.00 Футбол. Классика Лиги чемпионов УЕФА.
13.00 Бокс. Чемпионат Европы в Италии.
16.15 Теннис. Турнир АТР в Португалии.
17.45, 20.15 Футбол Кубок УЕФА.
18.45 Теннис. Турнир WTA в Чарлстоне.
21.15 Футбол. Го-о-ол!
21.30 Бокс. Чемпионат мира IBF/WBA в Германии.
23.30 Ралли. Чемпионат мира в Новой Зеландии.
00.00, 02.15 Новости “Евроспорта”.
00.15 Боевые единоборства. Турнир во Франции.
01.45 “Футбол. Из истории чемпионата Европы.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс(017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб’явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Нумар газеты аддрукаваны з дыяпазітываў заказчыка на ААТ «Красная звезда», 220073, г.Мінск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Падпісаны ў друк у 15.00. Аб’ём 2 друк. аркушы. Тыраж: 27 790 экз. Заказ № 628.